# 2025 г. - 120 гадоў з часу першага згадвання пра школу ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна (дзяржаўная ўстанова адукацыі «Павіццеўская сярэдняя школа»; 1905)



Першая школа на тэрыторыі в. Павіцце была адкрыта ў 1905 годзе. Гэта было аднакласнае народнае вучылішча, будынак якога знаходзіўся недалёка ад будынка сучаснай школы. У вучылішчы быў адзін класны пакой, колькасць вучняў - каля 70, навучалася тры групы дзяцей.

Вучні займаліся па 6-7 гадзін у дзень, праводзіліся ўрокі па рускай мове, чыстапісанні, арыфметыцы, спевам, гімнастыцы, закону Божаму. Тры разы на тыдзень вучні прыходзілі на хор, дзе развучвалі рэлігійныя песні. Па нядзелях і ў рэлігійныя святы дзеці разам з настаўнікам ішлі ў ў Свята-Міхайлаўскую царкву спяваць на кліросе. З 1905 года настаяцелем царквы быў свяшчэннік Ігнацій Паўловіч.

У жніўні 1915 года в. Павіцце акупавалі нямецкія войскі, у будынку вучылішча размясціліся кавалерысты, заняткі былі спынены. Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора (1921) заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы. У в. Павіцце была адкрыта шасцікласная школа з польскай мовай навучання. Будынак школы быў драўляны, меў тры класныя пакоі. У школе працавала пяць настаўнікаў.

Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939) у Павіцці была адкрыта сямігадовая школа. Настаўнікамі сталі жыхары вёскі Рыгор Яўстафавіч Сцябноўскі, Марыя Рыгораўна Кузіч. У гады Вялікая Айчыннай вайны будынак школы ператварылі ў паліцэйскі ўчастак, заняткі былі спынены. У сакавіку 1943 года паліцэйскі ўчастак быў разбіты партызанамі, будынак школы спалены.

У ліпені 1944 года Павіцце вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а 1 верасня 1944 года школа аднавіла працу. Размяшчалася яна ў прыватных дамах М. Р. Астапука, І. А. Дзехцерука, С. С. Дзехцерука, А. В. Чопіка і іншых жыхароў вёскі. Першы год заняткаў быў цяжкім - ішла вайна, не было падручнікаў, сшыткаў, алоўкаў. Дзеці вучыліся чытаць па газетах, першакласнікі выкладвалі літары з фасолі. Але з кожным годам школа папаўнялася падручнікамі,

пісьмовымі прыладамі, наглstriднымі дапаможнікамі, прыбывалі новыя настаўнікі.

У 1948 годзе школа ў вёсцы стала сямігадовай. Дырэктарам установы прызначаны выпускнік Брэсцкага педвучылішча Уладзімір Іванавіч Хім. Школа па-ранейшаму размяшчалася ў пяці прыватных дамах. Працаваць у такой школе было цяжка, бо настаўнікам прыходзілася хадзіць з аднаго дома ў другі.

У 1964 годзе пабудаваны і адкрыты новы двухпавярховы будынак школы. Першым дырэктарам школы стала Паліна Мяфодзьеўна Анічэнка (1964-1968). У 1970-х гадах у школе вучылася звыш 600 вучняў. Для тых, хто працаваў і хацеў вучыцца, была адкрыта завочная школа.

У 1990 годзе дабудавана новае крыло школы, дзе размешчаліся бібліятэка, кабінеты фізікі, геаграфіі, нямецкай мовы, інфарматыкі і інш. У 1996 годзе была прыбудавана майстэрня тэхнічнай і абслугоўваючай працы, частка якой у 2005 годзе была пераабсталявана. На яе базе адкрыты дзіцячы сад на дзве рознаўзроставыя групы, з прычыны чаго ўстанова адукацыі атрымала новы статус - «Павіццеўскі дзіцячы-сад-сярэдняя школа». У 2010 годзе ў рамках праграмы па адраджэнні і развіццю вёскі школа была капітальна адрамантавана.

Адной з галоўных каштоўнасцей школы з'яўляецца вялікі (на тры залы) гісторыка-этнаграфічны музей «Палешукі», які адкрыты ў 2007 годзе. Першая зала прысвечана асаблівасцям народнай культуры, мясцовага быту; другая - гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў праламленні на дадзеную мясцовасць, у трэцяй зале можна пазнаёміцца непасрэдна з гісторыяй школы.

У розны час школу ўзначальвалі Васіль Паўлавіч Бадза (1968-1971), Іван Аляксандравіч Дзехцярук (1971-1975), Анатоль Аляксандравіч Краўчук (1975-1982), Раіса Пратасьеўна Каморнік (1982-1983), Іван Лазарэвіч Будзько (1983-1995), Людміла Мікалаеўна Цецярук (1995-2002), Яраслаў Ільіч Коржык (2002-2007), Аляксандр Рыгоравіч Радковіч (2007-2021). З 1 верасня 2021 года і па сённяшні час школай кіруе Людміла Пятроўна Дзенісюк.

З 2022 года ўстанова перайменавана ў ДУА «Павіццеўская сярэдняя школа». Сёння гэта добраўпа-радкаваны, камфортны, абсталяваны неабходнай мэбляй, камп'ютарнай, мультымедыйнай і іншай тэхнікай адукацыйны комплекс. У

2024-2025 навучальным годзе ў школе навучаецца і выхоўваецца 121 вучань. Вучні школы атрымліваюць прызавыя месцы ў раённых, абласных, рэспубліканскіх конкурсах і алімпіядах, актыўна займаюцца навучальна-даследчай дзейнасцю.

За кожнай перамогай стаіць напружаная праца педагогаў – тых, хто ўмее разглядзець патэнцыял вучняў і развіць яго. Так, у 2021 годзе настаўнік беларускай мовы і літаратуры Наталля Васільеўна Цецярук узнагароджана заахвочваючай прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў адораных вучняў. Настаўніцы школы аграгарадка Павіцце Н. В. Цецярук і Н. І. Цецярук з'яўляюцца ўдзельнікамі праекта «Настаўнік для Беларусі», які нацэлены на прыцягненне ў школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў з новымі цікавымі ідэямі, імкненнямі да самаразвіцця. Калектыў школы ганарыцца тым, што тут у 1970-1980 гадах працавала выдатны педагог, настаўнік-філолаг Ганна Адамаўна Саўчук, якая ў 1981 годзе за працоўныя заслугі была ўзнагароджана высокай урадавай узнагародай - ордэнам «Знак Пашаны».

У розны час школу закончылі вядомыя ўсёй Кобрыншчыне былыя кіраўнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Уладзімір Рыгоравіч Кузіч і Іван Сяргеевіч Цецярук, былы начальнік Кобрынскага райаддзела міліцыі, а цяпер - начальнік упраўлення кадраў МНС Рэспублікі Беларусь Эдуард Аляксандравіч Ярашук, літаратар, цяпер жыхар Эстоніі Уладзімір Іванавіч Дзехцярук і многія іншыя знакамітыя землякі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Малой** радзімы прыцяжэнне : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 475-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах вёсак Павіцце і Лелікава Кобрынскага раёна / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2021. – 90 с. : каляр. фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**Дзяржаўнай** установе адукацыі «Павіццеўская сярэдняя школа» (1905) – 120 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 195.

**Саўчук Ганна Адамаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 74 : фат.

**Андросова, О.** Воспитание уважения к подвигам предков / Ольга Андросова ; фото из архива Повитьевской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 17 мая (№ 20). — С. 17 : фот.

Пионеры Повитьевской средней школы провели традиционную акцию "Обелиск".

**Андросова, О.** Встретились с воинами-афганцами / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 22 лютага (№ 8). — С. 17 : фот.

В Повитьевской средней школе прошло мероприятие, посвященное 36-й годовщине вывода советских войск из Афганистана.

**Андросова, О.** Встреча одноклассников / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 15 лютага (№ 7). — С. 17 : фот.

В Повитьевской средней школе Кобринского района прошел вечер встречи выпускников.

**Андросова, О.** Красота святынь Гродненщины / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 14 чэрвеня (№ 24). — С. 17 : фот.

Коллектив Повитьевской средней школы совершил паломническую поездку по святым местам Гродненщины.

**Андросова, О.** Лесное хозяйство: узнай профессию / Ольга Андросова ; фото из архива Повитьевской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 19 красавіка (№ 16). — С. 17 : фот.

Учащиеся 11 класса Повитьевской средней школы Кобринского района посетили профориентационную экскурсию в Повитьевском лесхозе.

**Андросова, О**. Лучшие в конкурсе / Ольга Андросова ; фото из архива Повитьевской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 7 июня (№ 23). — С. 17 : фот.

Учащиеся Повитьевской средней школы Кобринского района приняли участие в районном конкурсе "Украсим храм вместе!" и благотворительной акции "Давайте творить добро".

**Андросова, О**. Научились грамотно обращаться с деньгами / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 10 мая (№ 19). — С. 17.

Учащиеся 9-го класса Повитьевской средней школы приняли участие в тематическом занятии, посвященном вопросам личных финансов.

**Андросова, О**. Останови буллинг! / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 7 сакавіка (№ 10). — С. 17 : фот.

В рамках акции по профилактике буллинга "Я среди людей" учащиеся 5-го класса Повитьевской средней школы Кобринского района приняли участие в мероприятии "Стоп, буллинг!".

**Андросова, О**. Познакомились с традициями / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 1 сакавіка (№ 9). — С. 17 : фот.

В Повитьевской средней школе Кобринского района прошел цикл мероприятий, приуроченных к Международному дню родного языка.

**Андросова, О.** Последний звонок / Ольга Андросова ; фото из архива Повитьевской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 31 мая (№ 22). — С. 17 : фот.

В Повитьевской средней школе Кобринского района прозвенел последний звонок для учащихся 11 и 9 классов.

**Андросова, О.** Свою историю нужно знать / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 29 сакавіка (№ 13). — С. 17 : фот.

Для учащихся 5-го класса Повитьевской средней школы прошло мероприятие в формате устного журнала "Великая Отечественная война: героизм народа".

**Андросова, О.** Спасем лес вместе / Ольга Андросова ; фото из архива Повитьевской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 24 мая (№ 21). — С. 17 : фот.

В Повитьевской средней школе Кобринского района прошла акциия "Сдай макулатуру — сохрани дерево".

**Андросова, О.** Интеллектуальная игра для пионеров / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2024. — 21 снежня (№ 51). — С. 17 : фот.

Пионеры Повитьевской средней школы Кобринского района приняли участие в Республиканской интеллектуальной развлекательной игре "Большая пионерская игра".

**Бакун, Е.** Выпускники Натальи Тетерук идут в учителя / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 19 кастрычніка (№ 42). — С. 17 : фот.

**Бакун, Е.** О главных символах через флешмоб / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 5 кастрычніка (№ 40). — С. 17 : фот.

Учащиеся Повитьевской средней школы Кобринского района приняли участие во флешмобе "Символы родной страны".

**Бакун, Е.** Ответ один — беречь природу / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 12 кастрычніка (№ 41). — С. 17.

Учащиеся Повитьевской средней школы Кобринского района приняли участие в экологическом квесте "В поисках правильных ответов".

**Бакун, Е.** "Палешукі" устанавливают имена погибших земляков / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 14 верасня (№ 37). — С. 17 : фот.

О поисковой группе, действующей при историко-этнографическом музее "Палешукі" Повитьевской средней школы.

**Бакун, Е.** Растим гражданина / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 28 верасня (№ 39). — С. 17.

В Повитьевской средней школе Кобринского района прошел педагогический совет в форме диалоговой площадки на тему по предотвращению правонарушений среди несовершеннолетних.

**Бакун, Е**. Хранят историю родной деревни "Палешукі" / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 19 кастрычніка (№ 42). — С. 17 : фот.

Для ребят 5 класса Повитьевской средней школы Кобринского района была проведена заочная экскурсия "Школа в прошлом".

**Елизарова, Ж.** Педагог — это мастер / Жанна Елизарова ; фото: Дмитрий Белов и из архива Натальи Тетерук // Кобрынскі веснік. - 2023. — 30 верасня (№ 61). — С. 1, 8 : фот.

Педагог из Кобринского района Наталья Тетерук вошла в состав оргкомитета уникального проекта "Учитель для Беларуси".

**Елизарова, Ж.** Сельская учительница / Жанна Елизарова // Настаўніцкая газета. - 2023. — 29 верасня (№ 76). — С. 13 : фот.

Об учителе белорусского языка и литературы из аг. Повитье Кобринского района Наталье Тетерук.

**Яскевіч, С.** Турнір у памяць пра земляка / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2023. — 1 сакавіка (№ 40). — С. 10 : фат.

Пра турнір па валейболе памяці настаўніка фізкультуры У. В. Брышцена ў аг. Павіцце Кобрынскага раёна.

**Бакун, А**. Фестываль сустрэч / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 2 чэрвеня (№ 43). — С. 6 : фат.

Настаўнікі Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Кобрынскага раёна арганізоўваюць анлайн-сустрэчы з цікавымі людзьмі.

**Вовк, Ю.** Формула педагогического мастерства / Юлия Вовк ; фото из личного архива Натальи Тетерук // Кобрин-информ. - 2021. — 11 марта (№ 10). — С. 3 : фот.

Учитель Повитьевского детского-сада-средней школы Н. В. Тетерук награждена поощрительной премией специального фонда Президента Республики Беларусь за личный вклад в развитие способностей одаренных учащихся.

**Нікалаева, Н**. Змяніць школу і сябе / Надзея Нікалаева // Звязда. - 2021. — 10 ліпеня (№ 130). — С. 7 : фат.

Настаўніцы школы аграгарадка Павіцце — сярод пераможцаў праекта "Настаўнік для Беларусі".

**Цецярук, Н**. Літаратурныя сустрэчы / Наталля Цецярук // Настаўніцкая газета. - 2021. — 27 красавіка (№ 47). — С. 15.

Пра кніжны анлайн-фестываль у Павіццеўскай сярэдняй школе Кобрынскага раёна.

**Цецярук, Н. В**. "Мой гонар — мае вучні" / [Наталля Цецярук ; запісала] Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 6 сакавіка (№ 19—20). — С. 6 : фат.

Пра настаўніцу Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Н. В. Цецярук.

**Бакун, Е.** Воспитание через музейную деятельность / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 21 лістапада (№ 90). — С. 10 : фот.

Совет историко-этнографического музея "Палешукі" Повитьевского детского сада-средней школы получил диплом областного этапа республиканского конкурса.

**Бакун, А**. З любоўю да роднай зямлі / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 студзеня (№ 3). — С. 6 : фат.

Павіццеўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа — адна з самых прагрэсіўных устаноў адукацыі Кобрынскага раёна.

**Пашковіч, Л.** Вялікая памяць у маленькіх сэрцах / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2020. — 8 мая (№ 35). — С. 10 : фат.

У Павіццеўскім дзіцячым садзе-сярэдняй школе вядзецца работа па патрыятычнаму выхаванню моладзі.

**Пашкович, Л. В.** Повелительница формул / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 23 верасня (№ 74). — С. 5 : фот.

Об учителе математики ГУО "Повитьевский детский-сад — средняя школа" В. Н. Терещук.

**Савчук, М.** От школьных исследований к будущей профессии / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 21 мая (№ 21). — С. 3 : фот.

Учащиеся ГУО "Повитьевский детский-сад — средняя школа" активно занимаются учебно-исследовательской деятельностью.

**Вовк, Ю.** Наталья Тетерук: "Учитель может невозможное сделать возможным" / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2019. — 3 октября (№ 40). — С. 3.

**Пасияк, О.** Учись учить / Ольга Пасияк ; фото Василия Пивоварчика // Советская Белоруссия. - 2019. — 18 декабря (№ 240). — С. 1, 14 : фот.

Два педагога Повитьевского детского сада-средней школы Кобринского района участвуют в проекте «Учитель для Беларуси».

**Пашковіч, Л.** Па слядах юных краязнаўцаў / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 жніўня. — С. 4 : фот.

Са злёту лепшых краязнаўцаў вобласці каманда Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы прывезла 9 дыпломаў.

**Бакун, А.** Руская — па пашпарце, беларуска — у душы / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 6 кастрычніка. — С. 1, 3.

Аб настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Н. Цецярук.

**Пашковіч, Л.** Шыкоўная настаўніца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 студзеня. — С. 4.

Вучні Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы атрымліваюць прызавыя месцы ў раённых конкурсах і алімпіядах.

**Бакун, А.** Падмурак патрыятызму / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 13 мая. — С. 4.

У Павіццеўскім дзіцячым саду-сярэдняй школе працуе гісторыка-краязнаўчы музей «Палешукі».

**Закірава, М**. "Прыемна ўсведамляць, што прыносіш карысць людзям" / Марына Закірава // Кобрынскі веснік. - 2012. - 14 сакавіка. - С. 2.

Аб выкладчыцы Павіццеўскага дзіцячага садка-сярэдняй школы.

**Гармель, Е.** Счастливая судьба привела в Повитье / Елена Гармель // Заря. - 2007. - 24 марта. - С. 8.

Дмитрий Гусев – молодой учитель Повитьевского детского сада-средней школы.

**Школа** обзавелась… детским садом // Заря. – 2006. – 14 января.

В. д. Повитье состоялось открытие нового детского сада, который будет работать при школе.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Павіцце

***Установы:***

Павіццеўская сярэдняя школа

***Прадметы:***

Школы